ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
5
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 1 (1414)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
•Учора • Сёння • Заўтра•

### САВЕТ І ПАРТКОМ

універсітэта на сумесным пасяджэнні абмеркавалі пытанне аб удасканаленні камуністычнага выхавання студэнтаў універсітэта і зацвердзілі комплексную праграму ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на пяцігадовы тэрмін навучання. Быў зацверджаны таксама тэматычны план НДР на 1984 год.

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

### ПЕРШЫНСТВО

па класічнай барацьбе прайшло ва універсітэце. У агульнакамандным заліку першае месца заняў юрыдычны факультэт, другое — геаграфічны, на трэцім месцы—каманда фізфака.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

работы студэнцкіх саветаў інтэрнатаў. Лепшымі прызнаны: інтэрнат № 1 (старшыня студсавета В. Дубейка), інтэрнат № 4 (старшыня студсавета М. Разанцаў) і інтэрнат № 7 (старшыня студсавета В. Урбановіч), якія занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы.

**М. АНОШКА,**
старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома студэнтаў.

### КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

па кнізе С. Шынгарова «Іду на таран» прайшла на фізічным факультэце. На канферэнцыі выступіў герой кнігі — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны лётчык Барыс Іванавіч Коўзан, які здзейсніў чатыры тараны. Ён расказаў пра свой баявы шлях, пра сваіх таварышаў, з якімі разам ваяваў. З цікавасцю слухалі студэнты і выступленні сваіх таварышаў — студэнта-фізіка Няждану Букаву, Ігара Саўчанку, Уладзіміра Дзьяковіча.

**А. РУКШЫН,**
загадчык аддзела вучэбнай літаратуры бібліятэкі.

## ● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ! ●



— АКТЫЎНАЯ, ініцыятыўная. Ва ўсе справы ўносіць жывы агеньчык. Нават самыя звычайныя мерапрыемствы, калі за іх бярэцца Люда, пачынаюць іскрыцца неяк па-новаму.

— Цудоўны арганізатар, умее вельмі добра ладзіць з людзьмі.

— Надзвычай чулы чалавек.

— Акрамя вялікай грамадскай работы, Люда яшчэ і вучыцца выдатна.

Толькі так адзываюцца аб сакратару камітэта камсамола студэнты і выкладчыкі факультэта прыкладной матэматыкі.

**НА ЗДЫМКУ: сакратар камітэта камсамола факультэта прыкладной матэматыкі, кандыдат у члены КПСС Людміла Панчанка.**

Фота **С. Плыткевіча.**

## Віншуем з узнагародай!

ЗА ДАСЯГНЕННЕ высокіх спартыўных рэзультатаў у 1983 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР **Савіцкую** Галіну Уладзіміраўну, студэнтку II курса факультэта журналістыкі, бронзавага прызёра VIII летняй Спартакіяды народаў СССР па баскетболу, чэмпіёнку свету і Еўропы; Граматай Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны **Маджыдаў** Камандар Беладзі аглы, студэнт І курса юрыдычнага факультэта, сярэбраны прызёр VIII летняй Спартакіяды народаў СССР па класічнай барацьбе і **Рудзянкоў** Віктар Аляксандравіч, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту, трэнер па класічнай барацьбе.

## ● ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ ●

### ТВАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ АШЧАДНАЯ КНІЖКА

УСПОМНІМ, таварыш: XIX з'езд ВЛКСМ прапанаваў камітэтам камсамола краіны адкрыць Усесаюзны камсамольскі рахунак эканоміі і беражлівасці XI пяцігодкі. Пачаўся масавы маладзёжны пошук унутраных рэзерваў вытворчасці. На сённяшні дзень асабістыя рахункі эканоміі завялі ўжо каля 270 тысяч працоўных калектываў і больш за 5 мільёнаў камсамольцаў.

Азірніся навокал, таварыш. Ці ўсё зрабіў ты для таго, каб зберагчы хаця б адзін кілаграм металу, хаця б адну кілават-гадзіну электраэнергіі? Ці ўнёс прапанову па ўдасканаленні выкарыстання лабараторнага абсталявання? Ці схапіў за руку самадзейнага мастака, які, «упрыгожвае» сваімі малюнкамі бібліятэчную кнігу і стол аўдыторыі? Ці асудзіў лайдака і прагульшчыка? Ці зрабіў спробу павялічыць прадукцыйнасць сваёй працы? Ці заклікаў да гэтага таварыша па вучобе, рабоце?

Мы гатовы табе дапамагчы: надрукаваць у газеце твой востры сігнал, абмеркаваць разам з табой цікавую прапанову па эканоміі і беражлівасці, зрабіць набыткам камітэтаў камсамола, штабоў і пастоў «КП» каштоўны вопыт барацьбы за найбольшы ўклад ва Усесаюзны камсамольскі рахунак эканоміі і беражлівасці XI пяцігодкі. Па прыкладу «Камсамольскай праўды» адкрываем новую рубрыку «Твая камсамольская ашчадная кніжка». Нас будуць цікавіць не толькі канкрэтныя лічбы, але і канкрэтны вопыт арганізатарскай работы камітэтаў камсамола, штабоў і пастоў «КП» у барацьбе за эканомію і беражлівасць, удзел у рацыяналізацыі і вынаходніцтве, эфектыўнасць правадзімых рэйдаў і г. д.

У канцы года будуць падведзены вынікі. За справу, таварышы!

## ● ЖЫВІ, ІМГНЕННЕ! ●

### УВАГА: ФОТАКОНКУРС!

РЭДАКЦЫЯ газеты «Беларускі універсітэт» аб'яўляе фотаконкурс «Жыві, імгненне!». У ім могуць прыняць удзел усе жадаючыя. Мэта конкурсу: выявіць сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта таленавітых фотааматараў, пазнаёміць з іх творчасцю чытачоў газеты, наогул папулярызаваць фота як від мастацтва. Фотаконкурс будзе праводзіцца па трох тэматычных раздзелах:

1. **«Чалавек — творца свайго жыцця».** Здымкі павінны расказваць аб працоўнай дзейнасці, жыцці студэнтаў і выкладчыкаў, аб барацьбе за мір, аб развіцці культуры, мастацтва, самадзейнасці ва універсітэце.

2. **«Спатканне з незвычайным».** Здымкі, якія паказваюць прыгажосць і велічнасць нашай неабсяжнай Радзімы, багацце роднага краю.

3. **«Спорт».** Здымкі павінны раскрываць уздзеянне фізічнай культуры, спорту, турысцкіх паходаў на фарміраванне асобы, арганізацыю вольнага часу.

Вынікі конкурсу будуць падводзіцца па раздзелах у канцы 1984 года. Пераможцы, занятыя першыя месцы, будуць узнагароджаны Ганаровымі граматамі і каштоўнымі падарункамі, другія і трэція — Ганаровымі граматамі.

Жадаем творчых поспехаў!

Сёння на чацвёртай старонцы мы змяшчаем першыя работы, дасланыя на фотаконкурс. Іх аўтар — Ігар **Бышнеў**, студэнт біялагічнага факультэта.



● СЛОВА — ВЕТЭРАНУ ●

# ТРЫМАЦЬ РАЎНЕННЕ НА СТАРЭЙШАЕ ПАКАЛЕННЕ

**ЖАДАЕ МОЛАДЗІ ВЕТЭРАН ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ У. В. ЛЮТАЎ**

**«У апошні час усё часцей, асабліва начамі, пачалі турбаваць успаміны аб вайне. Відаць, таму, што я ўсё больш і больш пачынаю ўсведамляць, да якой страшэннай катастрофы можа прывесці ўсё чалавецтва бяздумная гонка ўзбраенняў. Людзі абавязаны захаваць мір. Вайна не павінна паўтарыцца»—такі галоўны матыў гучыць у адказах на пытанні анкеты рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт», прысвечанай 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, супрацоўніка універсітэта, палкоўніка ў адстаўцы, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміра Васільевіча ЛЮТАВА.**

**— Уладзімір Васільевіч, які эпізод з Вашай ваеннай біяграфіі запомніўся Вам на ўсё жыццё!**

— За 40 гадоў службы ў радах Савецкай Арміі адбылося шмат падзей. Гэта — прыняцце ваеннай прысягі, вучоба ў ваенным вучылішчы, лейтэнанцкія перадваенныя гады, служба ў Забайкаллі, вучоба ў Акадэміі, сустрэчы з выдатнымі палкаводцамі, работа ва універсітэце.

Але ў апошні час у памяці ўсё часцей і часцей я звяртаюся да самых суровых дзён майго жыцця — дзён Вялікай Айчыннай вайны. Пачаў я камандзірам батарэі — лейтэнантам, а закончыў камандзірам палка—падпалкоўнікам. Чым вышэй адказнасць, тым цяжэй. У 1944 годзе мяне, дваццацічатырохгадовага маёра, прызначылі камандзірам палка. Я ўспрыняў гэта як вялікі давер і вялікую адказнасць за жыццё некалькіх соцень людзей, за паспяховае выкананне баявых задач палком. «Баця»—так звычайна называлі камандзіраў, так называлі і мяне. І кожны раз цяплела на сэрцы ад гэтага слова. Так звярталіся да мяне і зусім маладыя салдаты, і тыя, хто быў амаль у два разы старэйшы за мяне.

Я здаваў экзамен на сталасць, на маральнае права кіраваць людзьмі, весці іх у бой. І як узнагароду, як прызнанне атрымаў імя «Баця». Тады і я адчуў сябе камандзірам.

**— Вы—удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Раскажыце, калі ласка, пра найбольш памятныя падзеі, звязаныя з гэтай аперацыяй!**

— У вызваленні Беларусі я ўдзельнічаў з восені 1943 года. Помняцца баі Першай Польскай дывізіі генерала Берлінга пад мястэчкам Леніна Віцебскай вобласці ў кастрычніку сорак трэцяга. Наш артылерыйскі полк падтрымліваў адзін з пяхотных палкоў гэтай дывізіі. Пазіцыі даводзілася мяняць вельмі часта. Наша артылерыя пераводзілася туды, дзе пачыналі наступленне танкі. Быў ранены.

**— Як, на Ваш погляд, сённяшняе маладое пакаленне нясе эстафету, прынятую ад Вашага пакалення!**

— Мне падабаюцца сучасныя маладыя людзі за іх смеласць, рашучасць, за пастаяннае жаданне вучыцца, працаваць. Я ўпэўнены і ў тым, што калі спатрэбіцца абараняць Радзіму са зброяй у руках, яны будуць такімі ж стойкімі і мужнымі, якімі былі ў гады Вялікай Айчыннай іх бацькі.

**— Як Вы лічыце, што больш за ўсё дапамагае выхаванню пачуцця адказнасці ў студэнцтва!**

— Перш за ўсё — асабісты прыклад бацькоў і старэйшых таварышаў. Ды і наогул моладзі патрэбна давяраць, даваць больш адказныя заданні —тады яна і сама будзе адчуваць гэтую адказнасць.

**— Як Вы ўяўляеце сабе подзвіг ва ўмовах сучаснасці!**

— Не маючы выдатных здольнасцей, атрымаць дыплом з адзнакай. Закончыць вышэйшую навучальную ўстанову без адрыву ад вытворчасці. Перакрыццё норм выпрацоўкі і высокая якасць працы. Заслужыць адзнакі салдацкай доблесці ў час ваеннай службы. Галоўнае—добрасумленнасць і любоў да працы, настойлівасць у дасягненні сваёй мэты.

**— Ці была ў Вашым жыцці сустрэча з газетай, якая дапамагла фарміраванню Вашага характару!**

— Франтавыя газеты некалькі разоў выступалі з апісаннем паспяховых баявых аперацый батарэі і дывізіёна, якімі я камандаваў у той час. Выступленні газеты кожны раз дазвалялі збоку глянуць на свае справы, прымушалі праяўляць больш патрабавальнасці да сябе, больш увагі і павагі да байцоў.

**— Што б Вы пажадалі чытачам газеты—студэнтам і супрацоўнікам універсітэта!**

— Жадаю міру. Поспехаў у вучобе і працы напярэдадні 40-годдзя вызвалення Беларусі, моцнага здароўя і чалавечага шчасця.

**Запісала А. ЗЯНКЕВІЧ, студэнтка факультэта журналістыкі.**

**НА НОСЕ... СЕСІЯ**

Фота **С. Плыткевіча.**



● КЛОПАТ ПРА АБІТУРЫЕНТА-84 ●

# НА ПАРОЗЕ ВЫБАРУ

**Школа юнага фізіка носіць салідную назву: секцыя фізікі навукова-тэхнічнага гуртка вучняў горада Мінска пры фізічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна. Кіруе ёю асістэнт кафедры агульнай фізікі Тадэуш Альфонсавіч Пяркоўскі. Заняткі праводзяцца на працягу двух гадоў для вучняў 9—10 класаў. Звычайна сюды ідуць сапраўдныя прыхільнікі фізікі. У гэтым годзе тут займаецца 52 чалавекі.**

**— Тадэуш Альфонсавіч, скажыце, калі ласка, з якой мэтай была створана школа!**

— Мы імкнуліся даць школьнікам расшыраныя веды па фізіцы, зацікавіць іх навукова-даследчай работай.

**— А школьная праграма!**

— Мы не паўтараем яе, але і не адрываемся далёка. У школе існуюць дзве формы работы: лекцыйная і даследчая. Даследчая — гэта заняткі ў навуковых лабараторыях, інакш кажучы, сапраўдная навуковая работа. Кожны вучань замацоўваецца за пэўнай кафедрай. Ім кіруе адзін з яе супрацоўнікаў, які дапамагае свайму падшэфнаму распрацоўваць навуковую тэму. Як правіла, гэта цікава і займальна. І школьнікі з задавальненнем ходзяць у лабараторыі.

На лекцыях старшакласнікі атрымліваюць тэарэтычныя веды. Лекцыі вядуць вопытныя выкладчыкі фізфака.

Упершыню ў гэтым годзе ў канцы навучання будзе праведзена навуковая канферэнцыя, на якой школьнікі будуць абараняць свае работы.

**— Тадэуш Альфонсавіч, а як у школе з наведваннем заняткаў!**

— Штогод, як правіла, адсейваецца чалавек 15—20. Але школьнікі, па-сапраўднаму ўлюбёныя ў фізіку, заканчваюць школу і прыходзяць да нас на фізфак. У асноўным гэта тыя, хто займаецца ў лабараторыях. Паступіўшы на наш факультэт, яны могуць уключыцца ў навукова-даследчую работу ўжо з першага курса і працаваць па тэмах сапраўдных навуковых работ. У гэтым розніца паміж імі і астатнімі студэнтамі, якія звычайна пачынаюць навуковыя даследаванні толькі з трэцяга курса.

Мы заходзім у лабараторыю ядзернай фізікі. Якраз цяпер тут займаецца «надзея» школы Гена Грынчык, вучань 9 класа СШ № 30 г. Мінска.

**— Гена, над чым ты зараз працуеш і чаму ты прыйшоў у школу юных фізікаў!**

— Цяпер я раблю універсальны блок сілкавання. Вельмі шмат мне дапамагае мой кіраўнік Сяргей Ляшко. А ў школу мне параіў пайсці мой сябар, які таксама захапляецца фізікай.

**— Ты хочаш звязаць сваё жыццё з фізікай!**

— Так, пасля заканчэння дзесятага класа я вырашыў пайсці на фізфак.

**А. КАРНІЕНКА, В. КАРАЛЕНКА.**

# ПРЫХОДЗЬЦЕ, ВАС ЧАКАЮЦЬ

ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ існуе на хімічным факультэце універсітэта школа юных хімікаў. Створана яна для таго, каб праводзіць прафесійную арыентацыю сярод школьнікаў, даваць больш шырокія веды ў галіне хіміі. Кіраўніком школы з'яўляецца дацэнт кафедры аналітычнай хіміі Станіслаў Антонавіч Мячкоўскі. Школа ў год набірае каля 50 чалавек.

Каб глыбей пазнаёміцца з надзённымі справамі вучняў, даведацца, якіх поспехаў яны дабіліся, чым займаюцца, я звярнулася да аднаго з выкладчыкаў школы А. А. Глінкевіча.

**— Скажыце, калі ласка, як праводзіцца набор у школу!**

— Раней у нас быў конкурсны адбор вучняў. Перавагай карысталіся тыя, хто ўдзельнічаў у конкурсах і алімпіядах, паказаў здольнасці да вывучэння хіміі. А вось у апошні час мы пачалі браць усіх жадаючых. Як паказвае вопыт, многія прыходзяць да нас, не зусім дакладна ўяўляючы, што такое займацца хіміяй. Але ёсць і такія, хто па-сапраўднаму палюбіў гэты прадмет.

**— Цяпер вельмі цяжкая, складаная праграма ў школе, асабліва ў старэйшых класах. Цікава, як вучні сумяшчаюць вучобу з наведваннем школы!**

— У нашу школу звычайна прыходзяць вучні, якія добра паспяваюць па ўсіх дысцыплінах у сярэдняй школе. Мы прымаем толькі па адпаведных характарыстыках і рэкамендацыях, якія выдаюцца дырэктарамі школ.

**— Заняткі ў школе даюць пэўныя перавагі абітурыентам пры паступленні ў адпаведнага профілю навучальныя ўстановы!**

— Я б не сказаў, што школа дае нейкія прывілеі сваім слухачам. У свой час я сам яе заканчваў. Усё залежыць ад агульнага ўзроўню ведаў абітурыентаў. Але калі, напрыклад, мы бачым, што на ўступных экзаменах два абітурыенты набралі аднолькавую колькасць балаў, то перавагу аддаём нашаму «юнаму хіміку», якога добра ведаем.

**Л. КАЗЛОВА.**

# ЛІЧБАЎ ЧАРОЎНЫ СВЕТ

**Жыў-быў кароль. І была ў яго дачка. Патрэбна дадаць, што была яна вялікай капрызніцай. Можа таму, калі прыйшоў час выбіраць жаніха, паставіла яна перад бацькам умову: толькі тады яе абраннік трапіць у палац, калі ўсім зняволеным, якія знаходзіліся ў падзямеллі царскага замка, скароцяць напалову час няволі. Бацька толькі пацешыўся з гэтай умовы. Але не прадбачыў кароль, што ў гэтай быццам простай справе спасцігне яго няўдача: ён не здолеў удвая скараціць зняволенне тым, хто быў асуджаны на ўсё жыццё. А прынцэса так і засталася на ўсё жыццё адзінокай.**

— Скажыце, а як, на вашу думку, можна было ў свой час дапамагчы каралю, які не надта добра ведаў матэматыку?

Гэтае «казачнае» пытанне задаў Віталь Рабушка сваім вучням са школы юных матэматыкаў, якая існуе пры механіка-матэматычным факультэце.

Тры гады назад, займаючыся на другім курсе, ён разам са сваім сябрам Сяргеем Каржаневічам упершыню сустрэўся з тымі, каго са школьнай парты прывабіў да сябе патаемны свет формул, ураўненняў, мностваў і лічбаў.

Пяцьдзесят чалавек з надзеяй глядзелі на двух, зусім не падобных на іх школьных настаўнікаў, маладых выкладчыкаў-студэнтаў. Хлопчыкі і дзяўчынкі, можна сказаць з упэўненасцю, чакалі не голых матэматычных абгрунтаванняў і не сухіх аксіём, да якіх ужо паспелі прывыкнуць. Ім патрэбна было адкрыць матэматыку як навуку, поўную творчай думкі. І зрабіць гэта павінны былі яны—Віталь і Сяргей. Зразумела, яны не спадзяваліся ўбачыць перад сабой вундэркіндаў. Сюды прыйшлі вучыцца звычайныя школьнікі. Можа толькі большай сабранасцю вызначаюцца яны сярод сваіх равеснікаў. Іменна гэтая сабранасць дапамагае Алене Лапатнёвай сумяшчаць заняткі ў школе юных матэматыкаў з выдатнай вучобай і да таго ж займацца грамадскай работай. Лена—старшыня савета атрада. А Наташа Бярэзіна цудоўна малюе. У школе яна—мастак насценнай газеты. Вадзім Пажывілка і Раман Барзянкоў паспяваюць у вольны час займацца спортам. Але ўсіх іх аб'ядноўвае адно—уменне думаць аналітычна і ў той жа час творча.

**Т. ГУСЕВА.**

● НАРОДНЫ ДЭПУТАТ ●

# СПРАВА, ЯКУЮ ЛЮБІШ



**Як адзначаецца ў нашай Канстытуцыі, кожны грамадзянін СССР ва ўзросце васемнаццаці гадоў мае права выбіраць і быць выбраным. Узрост студэнцкі — час вучыцца, спрабаваць сябе ў розных справах, у тым ліку — грамадскіх. Але не кожны ведае, што і сярод студэнтаў таксама ёсць народныя дэпутаты.**

АЛЕНУ ТАКАРСКУЮ часта можна застаць у камітэце камсамола механіка - матэматычнага факультэта. Тут заўсёды знойдзецца справа для яе. І гэта нягледзячы на тое, што хапае ёй клопату і як дэпутату Маскоўскага раённага савета народных дэпутатаў горада Мінска. Яна ўваходзіць у састаў камісіі па справах моладзі. Разам з калегамі ёй даручалі праводзіць агляд дзейнасці педагогаў - арганізатараў, што кіруюць мастацкімі, спартыўнымі і іншымі гурткамі пры ЖЭС.

Два разы ў месяц Алена сустракаецца з выбаршчыкамі. Часцей людзі ідуць да дэпутата па асабістых справах: каму кватэру трэба дапамагчы адрамантаваць, каму — маленькую дачку ў сад дзіцячы ўладкаваць. І заўсёды іх чакае ўважлівы і добразычлівы прыём.

Зараз Алена вучыцца на чацвёртым курсе. У яе не так многа вольнага часу, калі ўлічыць, што яна таксама займаецца і камсамольскімі справамі. Здавалася б, цяжка сумяшчаць адказныя грамадскія абавязкі. Але такой праблемы для Алены Такарскай не існуе. Гэта не ў яе характары — стаяць у баку ад жыцця.

**Э. ОЛІНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**
Фота **аўтара.**

# ПОБАЧ— ДОБРЫ ЧАЛАВЕК

**Камісія па справах моладзі пры выканкоме Маскоўскага райсавета Мінска даручыла дэпутату Ірыне Лапыр вывучыць пастаноўку пазакласнай работы з дзецьмі і падлеткамі ў домакіраўніцтвах. Зробленыя ёю вывады былі высокакваліфікаваныя, паведамленне выслухана ўважліва, многія прапановы ўвайшлі ў пастанову камісіі.**

ВЯСНОЙ 1982 года студэнтка геаграфічнага факультэта Ірына Лапыр стала дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў. Не выпадкова аказалі ёй такі давер. Заўсёды актыўная, уважлівая, дзяўчына ўмее працаваць з людзьмі, зацікавіць іх, арганізаваць на агульную справу. Яшчэ вучаніцай яна паказала сябе здольнай да арганізатарскай работы, добрасумленна выконваючы розныя даручэнні.

— Як хутка ляціць час! Вось і падыходзіць к канцу маё студэнцкае жыццё, — расказвае Іра.—Я ўжо на пятым курсе. А здаецца, зусім нядаўна сядзела за школьнай партай...

Дзяўчына пачынае расказ аб Слабодскай сярэдняй школе, аб прыгожых краявідах роднай Браслаўшчыны. Усім сэрцам яна там, дзе знаёмы кожны каменьчык, кожная сцяжынка. Яна паказвае фотаздымкі, з захапленнем расказвае аб Браслаўскіх азёрах.

Я прашу расказаць пра сябе.

— Звычайна пачалося маё жыццё,—гаворыць Ірына.—Паспяхова закончыла школу, паступіла ва універсітэт на геаграфічны факультэт. На першы погляд, усё ў мяне атрымліваецца лёгка, без асаблівых намаганняў. Але гэта толькі так здаецца. Калі мяне выбралі дэпутатам, паявілася нямала пытанняў і праблем. Патрэбна было размеркаваць дзень, каб паспець усё зрабіць. Заняткі на факультэце, падрыхтоўка ў бібліятэцы, камсамольскія справы, грамадскія абавязкі... Спачатку было цяжка.

Дапамаглі Ірыне парады старэйшых таварышаў, падтрымка сяброў. Вучыла яе і маці Соф'я Іосіфаўна, дэпутат сельскага Савета. Ганарыцца яна дачкою, радуецца яе поспехам.

Паважаюць Іру і таварышы.

— Не адзін год жывём мы разам у інтэрнаце, — гаворыць яе аднакурсніца Святлана Уласік.—Пра яе можна гаварыць толькі добрае. Шмат чытае, заўсёды сярод сяброў, умее падтрымаць размову, калі што паабяцае — выканае абавязкова.

Вучыцца Ірына выдатна. Шмат цікавых мерапрыемстваў арганізавала і правяла. Дэпутат раённага савета ў размовах са сваімі выбаршчыкамі імкнецца зразумець іх скаргі, дапамагае разабрацца ў складаных пытаннях, тлумачыць, дае парады. Добра, калі побач такі чалавек.

**І. НОВІКАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ ●

# ДРУЖНЫ КАЛЕКТЫЎ

ПАСЛЯ другога курса ў нас ствараюцца групы па спецыялізацыі. Два гады назад, прачытаўшы спіс сваёй новай групы па спецыялізацыі «Краязнаўства і турызм», я не была ўпэўнена, што ў нас атрымаецца сапраўдны калектыў. Вельмі ўжо розныя людзі ўвайшлі ў яе: з рознымі інтарэсамі, характарамі і звычкамі. Але аказалася ўсё наадварот. І штуршком да нашага аб'яднання быў, на мой погляд, навагодні бальмаскарад. Тады мы ўсёй групай падрыхтавалі маскарадныя касцюмы і канцэртную праграму. Было так прыгожа і цікава, што гэта захапіла ўсіх, ніхто не застаўся ўбаку.

Зараз мы з ахвотай рыхтуемся да кожнага мерапрыемства. А тон усяму задае наш камсорг Ала Белая. І калі яна скажа, што да конкурсу ці канцэрта патрэбна падрыхтаваць некалькі нумароў мастацкай самадзейнасці, мы не выстаўляем аднаго-двух чалавек, а рыхтуемся ўсёй групай, кожны ўносіць нейкую прапанову. Так было і на конкурсе палітычнай песні і плаката, і на вечары пасвячэння ў студэнты.

А па прапанове Уладзіміра Ляшчынскага ў нашай групе створаны сектар прафесійнага росту. Мы — будучыя экскурсаводы і павінны добра ведаць сваю сталіцу і свой край. Таму адказныя за работу гэтага сектара арганізуюць паездкі для групы праз Мінскае бюро падарожжаў і экскурсій.

Я ўпэўнена, што ў нас будзе яшчэ шмат цікавых сумесных мерапрыемстваў, бо мы жывём дружным калектывам, ніхто не застаецца абыякавым да спраў групы. Сёлета па выніках сацыялістычнага спаборніцтва на факультэце наша група заняла другое месца.

**Т. ГАСЦІЛОВІЧ,**
**студэнтка геаграфічнага факультэта.**

● ВАШЫ ЗАХАПЛЕННІ ●

# БІЯТЭАТР: 23 СПЕКТАКЛІ

**Аднойчы, рыхтуючыся да аднаго з вечароў, вырашылі студэнты біяфака зрабіць нешта незвычайнае. Доўга спрачаліся, гаварылі аб нудзе на ўсіх вечарах, аб тым, што прыйшоў час пакласці гэтаму канец. Пагаманілі, паспрачаліся і падрыхтавалі вечар гумару. Ён сапраўды быў не такім, як іншыя. Спадабалася ўсім: і гледачам, і тым, хто рыхтаваў праграму. Адбылося гэта ў 1976 годзе.**

А ў наступным, тыя ж дзяўчаты і хлопцы, што, як чараўнікі, ператварылі нуду ў весялосць, паставілі на вечары першакурснікаў спектакль-казку. Так пачынаў сваё існаванне Біятэатр. Дарэчы, чаму ён так называецца? Аб гэтым я запытала ў кіраўніка тэатра Аляксандра Песнякевіча:

— Мы доўга думалі, як жа назваць тэатр. Ён ужо нарадзіўся, існаваў, а назвы ўсё яшчэ не было. І вось калі мы рыхтаваліся да паказу рок-оперы «Ванька Жукаў — суперзорка», у некага ўзнікла думка назваць наш калектыў ГАБТ — галоўны атэістычны біялагічны тэатр, таму што опера наша насіла антырэлігійны характар. Але ж не ўсе нашы спектаклі мелі такую накіраванасць, і, адкінуўшы першую частку назвы, мы пакінулі другую — Біятэатр, таму што ў нашым тэатры біёлагі расказваюць пра жыццё свайго факультэта.

Хто ж можа прыйсці ў Біятэатр, атрымаць ролю? Кожны, хто пажадае. Той, хто вытрымае амаль штодзённыя рэпетыцыі. Біятэатр — гэта група людзей, якія жадаюць, каб другім не было нудна, каб з усмешкай успаміналіся студэнцкія вечары. Стаць удзельнікам Біятэатра можа кожны, але ёсць адна ўмова: прыходзячы, патрэбна несці з сабою жарт. Жартаўлівасць, вясёлы нораў — вось пропуск, якім патрэбна валодаць, наведваючы Біятэатр. Юнакі і дзяўчаты прыходзяць сюды на першым курсе, зацікаўленыя тым спектаклем, што ўбачылі на вечары пасвячэння ў першакурснікі, і застаюцца назаўсёды. Я не памылілася. Так, назаўсёды. Тыя, хто ўжо развітаўся з біялагічным факультэтам, не развітваюцца з Біятэатрам. Яны часта наведваюць малодшых сяброў, прысутнічаюць на новых пастаноўках і рэпетыцыях, збіраюцца на традыцыйныя «капуснікі», дзе ёсць і жарты, і смех, і размовы аб новых спектаклях. Такія вось сустрэчы дапамагаюць удзельнікам тэатра пасталець. Тут не крыўдзяцца на заўвагі «старэйшых». Ведаюць: яны дрэннага не параяць.

Менш чым за восем гадоў свайго існавання Біятэатр паставіў ужо 23 спектаклі. А. Песнякевіч жартуе:

— 23 і ўсе прэм'еры!

Гэта сапраўды так — кожны спектакль ідзе толькі адзін раз.

Біятэатр ніколі не паказвае сцэнак ці спектакляў па чужых сцэнарыях. Прычым у складанні тэксту прымаюць удзел усе. Калі ж сцэнарый напісаны, чытаюць яго разам, і кожны мае права выказаць свой пункт гледжання.

Удзельнікі тэатра ўпэўнены, што аб самым будзённым можна расказаць вельмі цікава. Ім удаецца зацікавіць гледачоў не толькі сюжэтам, але і формай паказу. Якой? Гэта патрэбна бачыць.

А як жа тыя, хто з'яўляецца ўдзельнікам гэтых спектакляў?

— Без Біятэатра не было б нас. Без яго нам бы нечага не хапала, магчыма, студэнцкага сяброўства.

Гэтыя словы сказаў пяцікурснік Ігар Сямашка. Зразумела, Біятэатр дапамагае сябраваць розным курсам, а калі побач шмат добрых сяброў, тады і жыццё цікавае, і цяжкасці пераносіць лягчэй.

**М. ЗАГОРСКАЯ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**НА ЗДЫМКАХ: кіраўнік тэатра малодшы навуковы супрацоўнік Аляксандр ПЕСНЯКЕВІЧ; чарговае выступленне.**
Фота **С. Плыткевіча.**





# РУЖОВЫ РАНАК

Літаратурная старонка

## НОВЫЯ ІМЁНЫ



**Алесь БАДАК**

### КУСТ РАМОНКАЎ

*Восень. Шчодра носяць воду хмары ў прыполах,*

*Ледзь трываючы ад холаду і ад знямогі.*

*Долу хіляцца рамонкі ў адзічэлым полі*

*І ніяк свае пялёсткі падабраць не могуць.*

### ДАВЕР

*Я нап'юся гаючай вясны,*
*Патану ў вясне і забуду,*
*Што на свеце—натруджаны*
*будзень,*
*Самы звыклы і самы зямны.*
*Незнаёмы даверлівы твар.*
*Незнаёмыя вочы шчыруюць,*
*Я забуду, што зло маскіруюць,*

*Я даверуся Вам,*
*Вочы, поўныя лёгкай журбы,*
*Вочы, поўныя светлага шчасця,*
*І ў вясну так захочацца ўпасці,*
*З ёю зліўшыся, хвілю пабыць,*
*Нібы цэлае, нібы адно,*
*І каб нехта хвілінай той проста*
*Стаў дабрэй, наталіўшы*
*ўдосталь*
*Сваё сэрца гаючай вясной.*

**Алена СТОРАЖАВА**

### РУЧАЙ

Шапатлівы ручай,

Да цябе падыйду,

Зазірну ў глыбіню—

І загінуць трывогі:

Гаваркі твой струмень

У касу я ўпляту,

У прахалоду тваю

Апушчу свае ногі.

Гаманлівы ручай,

Ты звіні праз жыццё,

Праз спякоту жніва,

Праз зімы халадэчу,

І хай поиць цябе

Грудзі маці-зямлі,

Спорны дождж веснавы,

Светлы сум чалавечы.

**Жанна ПАХОДНЯ**

### ЗОРКА

Ці ён, чарнявы, вінаваты,
Ці я, чарнявая, сама:
Зіхоча зорачка над хатай,
А ў сэрцайку маім — няма!..

Не раз сама сябе пытала,
А па шчацэ сляза цякла:
Ці ж зоркі я не шанавала,
Ці ж зоркі я не берагла?!.

Хто скінуў зорку з небасхілу —
Надзею светлую маю,
І дзе мне ўзяць такую сілу,
Каб зноў узняць яе ўгару?!

**Галіна РАКОЦА**

**На душы — прадчуванне зімы:**
**Хрустка,**
**марозна,**
**урачыста,**
**Небасхіл ад бяроз чысты,**
**грысты,—**
**Аж чысцейшымі сталі мы!..**

**Татьяна ОЛЕШКО**

Мне не надо середины:

Полумесяц—не луна,

Мне не надо половины:

Полусвет—почти что тьма;

Полуправда—лжи начало,

Полурадость—как беда.

Если «да»—вернись

с вокзала,

Если «нет» — пусть ни

следа!..

## НА ХВАЛІ НОВАГА ПРЫЛІВУ

З НОВЫМ 1984-м годам наша літаб'яднанне «Узлёт» уступіла ў 20-ы год свайго існавання. За гэтыя дваццаць гадоў былі ўжо ў ім і свае прылівы і пэўныя адлівы. Пра гэта можа сведчыць неперыядычнасць паяўлення паэтычных кніг літа'бяднання як адной са справаздачных форм яго дзейнасці. Першыя кнігі ўзлётаўцаў выходзілі, як гаворыцца, кучна: у 1965 годзе пад назвай, аднайменнай з назвай літаб'яднання, у 1967 — пад назвай «Натхненне». У 1969 годзе быў у нас рукапісны зборнік «Прысяга»; у 1971 годзе васемнаццаць узлётаўцаў было прадстаўлена ў своеасаблівай анталогіі «Універсітэт паэтычны», падрыхтаванай да 50-годдзя БДУ. І пасля гэтага толькі ў 1977 годзе выйшаў чарговы зборнік узлётаўцаў «Вёсны».

Цяпер можна гаварыць аб новым прыліве пачаткоўцаў у наша літаб'яднанне. Думаецца, што неўзабаве паявіцца яшчэ адна кніга ўзлётаўцаў, якую мы зараз рыхтуем і якой хочацца сустрэць не толькі 20-годдзе «Узлёту», але найперш славутыя гадавіны — 40-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 40-годдзе векапомнага Дня Перамогі.

**А. ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».**

**Сяргей КАВАЛЁЎ**

### ПЛЮШЧ

*Шмат ворагаў лезла на муры.*

*Жывыя, яны падалі мёртвымі.*

*Аднаму табе даравалася.*

*Пажаўцелі косці абаронцаў*

*і захопнікаў,*

*Пастарэў нават змрочны*

*камень.*

*Ты—малады і жаўцееш толькі*

*ўвосень.*

*Зялёны плюшч захапіў увесь*

*замак...*

**Ірына САБАЧЭЎСКАЯ**

### МАРГАРЫТА АДВЕРНІК

«Маргарыта Адвернік,—
Вусны шэпчуць імя,—
Я, Францыск Скарына,
З Полацка я».

Вы, сівыя стагоддзі,
Сведкі даўніх падзей,
Хоць лёс з каханнем не ў
згодзе,
Ды каханне мацней.

Праз вякі і дарогі
Голас ціхі ў журбе
Праз растанне, трывогі:
—Я чакаю цябе!..

**Валянціна МІСЮК**

### ЗІМОВЫ ПЕЙЗАЖ

*І ціхая журба,*

*І доўгая дарога,*

*І сумная вярба*

*Пад сцежкаю аблогай.*

*О, як жа гэта многа:*

*Снягоў нямая даль,*

*Цяпла скупая дань*

*І па вясне трывога!..*

***

*У таты майго столькі*

*тамоў*

*Перааранага поля, што я*

*баюся:*

*Мне не хопіць цэлага*

*жыцця,*

*Каб усе іх прачытаць.*



**Алена ЗАБАРОНАК**

### ДВА ВЕРШЫ

***

Мне доўга так стаяць,
Вачэй не апускаючы,
Глядзець, як дрэвы спяць,
Ледзь чутна снег губляючы.
Раптоўна крок зраблю
У заснежаную казку я.
«Даруй,— скажу,— люблю
Пяшчоту, ціш і ласку я...»
А лес будзе маўчаць
(Прыйшла з якое далечы?.. ),
Ледзь чутна снег губляць,
Завеі ўспамінаючы...

***

Зорным золкам падымуся
Па знаёмай сцежцы зноў,
Закружуся, засмяюся
Харастваў птушыных моў.
Хай маладзічок за хвою
Прысхаваецца знарок,
Зоркі знікнуць, быццам хто іх
Замалюе ў сіні змрок,—
Закружуся, засмяюся
Харастваў птушыных моў —
Зорным золкам падымуся
Па знаёмай сцежцы зноў!..

**Леанід ТРУБАЧ**

### ГАЛБЯЦА

**Вечна прагавіты з кветкай**
**парадніцца,**
**Паказаў бульбоўнік баязліва**
**вочы.**
**Сны мае люляла ціха Галбяіца,**
**Дзе па вербах вецер ціха**
**крочыць**
**І дзе шаблі промняў мые**
**сонца,**
**З-пад вясельца пырскі — на**
**рамонках росы,**
**Адкрыццём Радзімы —**
**мройная бясконцасць**
**За ракою бацькі няскошаных**
**пракосаў.**

### КРОКІ

*Памяці М. Мароза.*

**Крок. Першы, другі...**
**дзевяты...**
**Крок ад людзей і да людзей**
**крок.**
**Здрыгануліся сэрцы былых**
**салдатаў.**
**Крык пад неба: «Сыночак!**
**Сынок...»**
**Не адразу зямля аддае былое,**
**Іржавым выбухам кроіць**
**памяць.**
**Упершыню дзесь ступіла**
**малое,**
**Карагодзіць над полем белая**
**замець.**
**Крочу асфальтам і ранішняй**
**сцежкай,**

**На мастах невядомасці я не**
**стаю.**
**Адгукнецца ўспамін журботнай**
**усмешкай,**
**Словы выбухнуць, як жа я іх**
**стаю!**
**Крокаў, крокаў розных —**
**тысячы!..**
**Каб не вінавціла сумленне**
**болей,**
**Ці змог бы я гэтаксама**
**высечы**
**Крок звычайны на**
**незвычайным полі!**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

5 студзеня 1984 г.

Зак. 19. АТ 07510

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ